СУЗОР'Е БРАЦТВА

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

...У залацістых промнях сонца неяк асабліва прыгожа выглядае белакаменны будынак электрастанцыі «Дружба народаў». Парывісты летні вецер калыша сотні чырвоных сцягоў, рознакаляровыя флагі трох брацкіх рэспублік — Беларускай, Літоўскай і Латвійскай.

У багатым святочным убранні і станцыя, і калгасны парк, і шырокія вуліцы вёскі. Хутка пачнецца вялікая ўрачыстасць, прыедуць дарагія госці. А запрашэнні былі пасланы ў гарады і вёскі Латвіі і Літвы, у Полацк і Мінск, у Ленінград, Маскву, Кіеў.

І вось у вёску Дрысвяты на свята, прысвечанае пуску гідраэлектрастанцыі «Дружба народаў», з'ехалася звыш 20 тысяч гасцей. Як рэкі вясной з розных бакоў збіраюць свае бурлівыя патокі, гэтак жа ў нядзелю 19 ліпеня 1953 года ў Дрысвяты сцякаўся бясконцы паток людзей.

Так пачынаецца цікавая і змястоўная брашура[1]) В. І. Казлова, прысвечаная развіццю нацыянальных адносін у нашай краіне. У брашуры крыху больш за шэсцьдзесят старонак, але колькі яна змясціла пераканаўчых фактаў, цікавых жыццёвых назіранняў, якія расказваюць аб росквіце эканомікі і культуры народаў Савецкай краіны, прыгажосці нашай зямлі, яе свабодных і роўных сыноў!

«Чым ты была, Беларусь мая родная?..» Міжволі прыходзяць на памяць гэтыя ўсхваляваныя словы паэта, калі азірнешся на круты і ўзнёсты шлях нашай рэспублікі — ад дымнай лучыны да агністага зарыва магутных электрастанцый, ад зрэбнай сярмягі да заможнасці і дабрабыту, ад каравых непісьменных «крыжыкаў» да вышынь навукі і культуры.

Да рэвалюцыі Беларусь была адсталай, занядбанай ускраінай царскай Расіі. Напрыклад, у 1913 годзе на душу насельніцтва ў цэлым па краіне выпускалася прадукцыі машынабудавання на 5 рублёў, а па Беларусі — на 48 капеек, гэта значыць у 10 разоў менш, электраэнергіі адпаведна 14 кілават-гадзін і 0,43 кілават-гадзіны, гэта значыць амаль у 32 разы менш.

Векапомны Кастрычнік непазнавальна змяніў аблічча нашай рэспублікі, расхінуў перад беларускім народам бязмежную сонечную далячынь. Над соннай плынню азёр і рэк заракаталі, загулі турбіны, паўсталі «з блакітнага дня» індустрыяльныя гмахі-волаты. Цяпер Беларусь, насельніцтва якой складае 4 працэнты ад насельніцтва СССР, выпускае звыш 15 працэнтаў агульнасаюзнай вытворчасці трактараў, 11,3 працэнта металарэзных станкоў, 13,4 працэнта веласіпедаў, 15,5 працэнта здабычы торфу, 10,5 працэнта баваўняных тканін. На тысячу жыхароў у нашай рэспубліцы выпускаецца металарэзных станкоў больш, чым у ЗША, Англіі, Францыі, Японіі; аўтамабіляў — больш, чым у Італіі; трактараў — больш, чым у ЗША і Францыі; матацыклаў — больш, чым у Англіі і Заходняй Германіі. У 1962 годзе электрастанцыі рэспублікі выпрацавалі 4 мільярды 641 мільён кілават-гадзін электраэнергіі супраць 3 мільёнаў кілават-гадзін у 1913 годзе.

Прадукцыя з маркай беларускіх заводаў і фабрык разыходзіцца па ўсім свеце: яе купляюць 53 краіны. А да рэвалюцыі галоўным відам экспарту Беларусі былі пянька ды сала...

Натхнёна расказвае аўтар аб культурным узлёце нашай рэспублікі. 25 вышэйшых навучальных устаноў, Акадэмія навук з 32 навукова-даследчымі інстытутамі, 11 прафесіянальных тэатраў, звыш 12 тысяч школ, больш як 20 тысяч бібліятэк... Колькі чыстых крыніц духоўнага багацця бруіцца на нашай зямлі, колькі жыватворнага святла ў нашым доме!

Пра тое, чым была і чым стала Беларусь, добра сказаў наш зямляк Мацвей Райцаў. 30 гадоў назад лёс

[1]) В. І. Казлоў. Саюз свабодных і роўных. Палітвыдавецтва, М., 1964.

З. ДОКТАРАЎ,
кандыдат філасофскіх навук.